# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫКАЗКІ ПРЫМАЎКІ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ

№ 16061 82.3(2=Бел)-44
Б43

# БЕЛАРУСКІЯ ПРЫКАЗКІ ПРЫМАЎКІ ФРАЗЕАЛАГІЗМЫ

Склаў Ф. Янкоўскі

ВЫДАННЕ 3-Е, ДАПРАЦАВАНАЕ, ДАПОЎНЕНАЕ

МІНСК «НАВУКА І ТЭХНІКА» 1992

*Настаўнікам Беларусі прысвячаецца*

# РУПЛІВЕЦ У МАТАЧНІКАХ РОДНАГА СЛОВА

Можна сказаць, што з Фёдарам Янкоўскім мяне звёў выбар прафесіі. Пазнаёміліся мы ў Мінскім педінстытуце восенню 1948 года, калі ён, дыпламаваны настаўнік беларускай мовы з Радашковіч, паступіў у аспірантуру па кафедры беларускай мовы. Здарылася так, што мяне, студэнта выпускнога курса, пасялілі ў пакой аспірантаў. Ф. Янкоўскі ўпаў у вока акуратнасцю ў словах і паводзінах, спецыфічна беларускім складам душы: рахманай дабрынёй, тактоўнасцю, быццам не дзюбануў чалавека крумкач вайны, не азлобіла акупацыя і партызаншчына. Праўда, ён меў нюх на людзей няпэўных, знячуленых, прыпсаваных, старанíўся іх, а на легкадумных, бесклапотных глядзеў паблажліва, спачувальна.

Мяне ўразіла, што Янкоўскі быў вольны ад комплексу насцярожанасці да «заходнікаў», а тады ж такі комплекс уваходзіў у ідэалагічны канон класавай пільнасці.

Аднойчы ў гутарцы мне прыйшла на памяць збянтэжанасць, якая ахапіла нас, партызан з Заходняй, калі мы трапілі першы раз у нейкую ўсходнюю вёсачку ля Дзяржынска, чакалі, як той Пераменіск, сустрэць прыгажуню, а ўбачылі спалоханую галадранаўку. Фёдар адказаў на мой задзірысты выпад згодаю: «У заходніх вёсках мы, партызаны, не мелі ніводнага выпадку даносаў і прадажніцтва». Сказаўшы гэта, ён папрасіў мяне быць больш асцярожным у размовах на сацыяльна-палітычныя тэмы.

Ф. Янкоўскага, усходніка, як магнітам цягнула ў Заходнюю, тут ён бачыў цудам захаваны матачнік беларушчыны, сховак народнага складу жыцця.

Першым гуманітарна-лінгвістычным палігонам для Ф. Янкоўскага паслужыла, натуральна, родная вёска

Клетнае, а потым і ўся Глушчына — зямля бацькоў. Тут ён сустрэў тып нацыянальнага характару і эталон беларускага маўлення, адзіны на ўсё жыццё. У 30-я гады, пасля Рагачоўскага педвучылішча, лёс закінуў яго на Міншчыну, у зону цэнтральных беларускіх гаворак. Тады ён быў ужо свядомым патрыётам Беларусі, далучаным да яе бядовага лёсу, пароднены з пакутлівай драмай сялянства, трагедыяй інтэлігенцыі. Уладкаваўшыся на завочнае аддзяленне Мінскага педінстытута, бачыў акты публічнага глуму над беларускімі пісьменнікамі, вучонымі, дзяржаўнымі дзеячамі. Адсюль пайшоў на фінскую вайну, сюды вярнуўся інвалідам, прадаўжаў настаўнічаць, завёў і ў часе акупацыі страціў сям'ю ад рук фашыстаў, стаў народным помснікам, начальнікам разведкі партызанскага атрада «Грозны». З пэўнасцю магу сказаць, што сярод мнагатысячнай армады беларускіх партызан не знайсці такога аўтарытэтнага, паважанага жыхарамі камандзіра, які партызаніў так сумленна, як і настаўнічаў. Дарэчы, любімым яго разведчыкам быў вучань Алік. Бальзамам для зраненай душы сталі пачцівыя адносіны кондавых суполак заходнебеларускіх вёсак, не абязвечаных, як у суседніх «усходніх» вёсках, высылкай элітных сем'яў, што вылучаліся не багаццем, а саліднасцю, аўтарытэтам. Кліманты, базавую вёску разведкі, ён успамінаў, як нейкі райскі востраў беларускага народнага жыцця, дзе і ў вайну людзі паводзілі сябе годна, давяралі адзін аднаму, а яго любілі. Такія матачнікі народнай культуры выдавалі на свет у добрыя часы сваіх песняроў — Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Браніслава Тарашкевіча. Сына апошняга Ф. Янкоўскі апекаваў і пра яго смерць у пекле блакады расказваў з глыбокім болем, вінавацячы сябе, што не змог угаварыць таго неаперанага арляняці перачакаць блакаду дома.

Трэцяй зонай жыццёвай і навуковай дзейнасці Ф. Янкоўскага стала Навагрудчына. Я рады, што паспрыяў знаёмству вучонага з Наднёманскім краем. Недзе ў пачатку 50-х гадоў я запрасіў яго паехаць за кампанію на выхадны дзень да майго бацькі. Стары, не маючы сілы адбудаваць спаленую сялібу, жыў пры млыне Крынкі над Серваччу ў казённай кватэры. Другая палавіна хаты служыла завозніцкай. Там бавілі час, чакаючы чаргі, сяляне. Памятаю, з якім азартам накінуўся Янкоўскі на ахвочых да гаворкі са свежым чалавекам людзей.

— Якая ўробленая ў вас зямля, якая дагледжаная,—

захапляўся Фёдар Янкоўскі.— І ў нас была такая ж пры першых калгасах, а цяпер насоўваецца ад году да году горш і горш запусценне.

— Тут не запусцее,— адказаў я.— Бачыш, вёска на вёсцы сядзіць. Вунь тая ля гасцінца, пад гарою, Бярозавец, Яўхім Карскі фальклор тут запісваў.

— Я думаў калісьці таксама... Але ж вось апустошылі Клетнае пустадомкі. І ў вас тое будзе. Дай час...

На млыне Янкоўскі сустрэў такіх інфарматараў, такіх раскаваных ды цікавых субяседнікаў, што ажно ўвесь святлеў. Праз два дні вяртаўся ў Мінск з поўным блакнотам нататак. Пасля ездзіў са мной пад выхадныя некалькі разоў, а недзе ў канцы 50-х, падахвочаны Брылём, прыехаў з жонкай і дачкой на ўсё лета ў Свіцязянскае лясніцтва адпачываць і моцна прыкіпеў да гэтай зямлі, здружыўся з сям'ёй ляснічага, які сам і яго сямейнікі гаварылі на крынічна чыстай любчанскай гаворцы. Знаёмы па мінскім інтэрнаце настаўнік-краязнавец Міхал Петрыкевіч стаў для Янкоўскага праваднікам па Наваградчыне, Дзятлаўшчыне, Любчаншчыне. Некалькі летніх канікулаў Ф. Янкоўскі правёў над Шчарай, у калгасным Доме адпачынку «Рэчанька», хадзіў па слядах Федароўскага.

Не забываў руплівец і садоў беларушчыны ў родным Глускім раёне, дзе працаваў пасля «партызанкі» два гады сакратаром рэдакцыі раённай газеты і пачаў тады збіраць народныя прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы. Рэгулярна наведваў маці, што жыла ў Клетным ва ўласнай хаце пад чулай апекай старэйшага брата Архіпа.

Радашкоўшчына, з якою парадніла ваенная бяда і змаганне супраць фашызму, засталася такой жа роднай зямлёй, як і Глушчына. Прывыклы да сістэмнасці і паўнаты пазнання, Янкоўскі прысвячаў летнія адпачынкі і Петрыкаўшчыне і беларускаму Паазер'ю на Віцебшчыне. Адным словам, практычна ўся Беларусь была ў абсягу яго навуковай дапытлівасці, руплівасці і любові.

Яшчэ аспірантам, забываючы на дакучлівую, нажытую ў вайну хваробу страўніка, Ф. Янкоўскі заўсёды быў гатовы далучыцца да гурту і ехаць на рыбалку з начоўкай на Беразіну пад Барысаў. Не было ў яго і тады няўдачлівых вандраванняў, як у нас «чыстых» спінінгістаў. Ён умеў вывудзіць гаваркое слова, а то і некалькі прыказак пры любой пагодзе і нягодзе. Часам прачытваў мне залатыя слоўкі, але не любіў хваліцца, хаваў іх у запісах да пары, пакуль асэнсуе навукова і жыццёва.